Жыві, Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 194 [207] 4 кастрычніка 1991 г. Пятніца.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.



Факты, аргументы, комментарии, суждения

По специальности...

НИЖНИЙ ТАГИЛ. **Здесь появилось новое общественное формирование — политический клуб «За демократические реформы».**

Инициаторами его создания являются бывшие работники горкома КПСС. Уже состоялось два заседания, на которых присутствовало 10 человек.

Строили по южному проекту?

БОБРУЙСК. **Сегодня преподаватели и учащиеся средней школы № 18 намерены объявить забастовку.**

На такую акцию они вынуждены пойти в связи с тем, что здание школы оказалось не готовым к зимнему сезону: отсутствует горячая вода, в аварийном состоянии электрооборудование, не работает столовая.

Обращения к местным властям и депутатам по вопросу подготовки школы к зиме не дали положительных результатов, поэтому принято решение пойти на крайнюю меру.

А красного не нашлось?

ПОЛОЦК. **В ночное время со здания горсовета кто-то сорвал только что поднятый бело-красно-белый флаг республики.**

Будь эта акция политической, «подпольщики» могли, например, установить взамен украденного красное полотнище. Раз этого не случилось, приходится считать происшествие заурядным хулиганством.

Колбасный тракт

ШКЛОВ. **Более четырех с половиной тонн испорченных колбас и сосисок обнаружены в придорожной канаве вдоль полевой дороги, ведущей из деревни Чемоданы.**

Органы милиции приступили к расследованию преступного факта.

Госкомстат опровергает

тех, кто объясняет пустоту наших прилавков припрятыванием дефицитных товаров.

«Предварительные» показатели за девять месяцев этого года свидетельствуют о том, что по многим видам в стране идет стабильное падение производства: тканей — на 10 процентов, льняных волокон и шерсти — на 30 процентов.

Год назад в нашей стране было немножко светлее — электролампочек на прилавке появилось на 20 млн. штук меньше, сократился выпуск школьных тетрадей, карандашей, папирос и сигарет.

Все это — плюс к набившим оскомину дефицитам: от лезвий для бритья до стиральных порошков и туалетного мыла...

Четверо с гранатометом

ТЮМЕНЬ. **В 60-ти километрах от Уфы были задержаны четверо бывших сотрудников рижского ОМОНа, передислоцированного в Тюмень.**

По их словам, они направлялись в Москву. Эти четверо 21 сентября подали рапорт на увольнение, и через день были уволены. Затем они самовольно взяли машину и уехали в неизвестном направлении, имея при себе автомат Калашникова, гранатомет, два «цинка» с патронами и ящик гранат. Прокурором Тюменской области возбуждено уголовное дело по ст. 218 УК РСФСР — «Незаконное ношение и хранение оружия, боевых припасов и взрывчатых веществ».

Крымские прииски

Окончание курортного сезона в Евпатории отмечено появлением на местных пляжах многочисленных искателей золота.

Вооруженные самодельными приборами, старатели прочесывают с утра до вечера береговую полосу в поисках драгоценностей, утерянных рассеянными отдыхающими.

Нередко счастливчикам удается находить кольца, цепочки и другие украшения, но, как правило, ценность находки бывает неравнозначна затраченному времени.

Вкратце

▲ День Конституции СССР—7 октября — остается в этом году нерабочим праздничным днем. Пока никаких актов, отменяющих этот государственный праздник, Верховным Советом страны не принималось.

▲ Сегодня должно состояться очередное заседание Балтийского совета на уровне руководителей Прибалтийских республик, участники которого разработают единую тактику на предстоящих двусторонних межгосударственных переговорах Латвии, Литвы и Эстонии с СССР.

▲ Страны-члены СЭВ продлили действие Устава, а также конвенцию о правоспособности СЭВ до 1 ноября нынешнего года.

▲ Новый руководитель советской внешней разведки Евгений Примаков заявил, что в своей работе будет стремиться к развитию гласности в тех аспектах внешней разведки, где это возможно.

«Кодак», «Паркерс», «Вако»...



В Минске в помещении издательства «Белорусский Дом печати» открылась выставка-семинар полиграфического оборудования.

Представители крупнейших фирм — производителей издательской техники, такие, как «Кодак», «Вако», «Паркерс» и другие, предлагают свои услуги не только издательствам Белоруссии, но и другим республикам в оснащении их современной полиграфической техникой.

На выставке представлено оборудование для электронного набора, обработки текста, цветоделения, получения печатных форм и многое другое.

НА СНИМКЕ: во время открытия выставки.

Ответчик — Лукьянов

На заседании Ленинского народного суда Москвы по личному иску народного депутата СССР С. Белозерцева стало известно о новых крупных хищениях государственных средств в секретариате парламента СССР.

Как заявил на суде народный депутат, он располагает материалами о том, что сумма хищения составляет 2 миллиона 647 тысяч рублей. Ему также известны люди, принятые на работу в секретариат по принципу личных связей с начальством, которые участвуют в присвоении крупных сумм.

Ответчиком по личному иску депутата является бывший Председатель Верховного Совета СССР Анатолий Лукьянов, который по неизвестным причинам на заседание суда не явился.

«Неотложка» взбунтовалась

Такого еще не бывало: перед зданием Моссовета выстроились десятки автомобилей «скорой помощи».

Московская «неотложка» взбунтовалась. Главное требование врачей городской «скорой» — повышение зарплаты, предоставление льготного пенсионного возраста, страхование сотрудников. Если мэрия откажется выполнить требования стачкома до 1 ноября, случится страшное: больным москвичам никто не сможет оказать неотложную медицинскую помощь в течение нескольких дней.

Есть ли золото в запасе?

Противоречивые высказывания высокопоставленных советских официальных лиц о размерах золотого запаса Советского Союза вызвали настороженность в американских деловых кругах.

Заявление известного экономиста Григория Явлинского о том, что золотой резерв Советского Союза в настоящее время сократился до 240 тонн, не совпадает с мнением одного из руководителей Госбанка СССР Александра Думнова об имеющихся в наличии 374,5 тоннах золота.

Обе цифры противоречат подсчетам западных экспертов. Часть из них утверждает, что советский золотой запас находится на уровне 1.000 тонн, другая убеждена в том, что золотые резервы достигают 3 тысяч тонн, в то время как ЦРУ США в специальном докладе называло цифру в 4,5 тысячи тонн.

Тем не менее с точки зрения ведущего экономиста одного из крупнейших инвестиционных банков США Уильяма О'Нила, «для международного рынка более важен уровень добычи золота, нежели его запасы». По некоторым данным, объем добычи в последнее время сокращается постоянно, и в этом году не должен превысить 200 тонн.

С руководства взятки гладки...

ВАРШАВА. **Выставку взяток, которые просители пытались всучить работникам бюро по трудоустройству в Стараховицах (Селецкое воеводство), организовал руководитель этого учреждения.**

Каждое «доказательство благодарности» содержит информацию: кто и за что хотел подкупить чиновника. Предлагаемый взяточниками ассортимент не отличается большим разнообразием — конверт с банкнотами, коньяк, заграничные «сувениры».

Считают, однако, что открытие такой выставки может иметь обратный эффект: клиенты перестанут верить, что в этом бюро можно вообще что-либо решить.

Выпуск подготовлен по сообщениям Ирины ДЕРГАЧ, Леонида ФАДЕЕВА, Сергея БУТКЕВИЧА, Николая КОМЛЕВА, агентств «Урал-акцепт», «Инфо-нова», ТАСС. Фото Геннадия СЕМЕНОВА.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

Разоблачение

«УНИЧТОЖИТЬ НА МЕСТЕ...»

О том, как действовали в дни путча

Во всем, понятно, виноват Ельцин. Он объявил департизацию, департизация разбудила компартию, компартия породила ГКЧП...

Того, кто думает иначе, хочу познакомить с тайным документом: «Информацией секретариата ЦК КПСС» от 13 августа 1991 года. Бумага была направлена по спецсвязи в ЦК компартий союзных республик, рескомы, крайкомы и обкомы партии. Главный коммунистический штаб накануне «чепистского» переворота призвал своих функционеров на местах использовать **«все средства для разоблачения антидемократической сущности Указа Президента РСФСР от 20 июля»**, напомнил о незыблемости ранее спущенных рекомендаций по **«проведению открытых партийных собраний, применению различных форм публичных протестов»**. Ну, и, разумеется, о том, что **«следует критически воспринимать сообщения демократической прессы...»** А чтобы секретная инструкция не попала к неверным, была учинена безжалостная приписка: **«По минованию необходимости подлежит уничтожению на месте»**.

Однако с распространением «подпольного» циркуляра на Витебщине вышла неувязка. Из общего отдела обкома бодрящее средство отправили в глубинку только 22 августа, когда ГКЧП уже иссяк... И все же осмелюсь утверждать, что смысл документа был известен на местах заранее. Веря в это, легче объяснить политический фарс в толочинской постановке...

Утром 19 августа ответственные работники райкома КПБ, узнав о воцарении Янаева и К°, почувствовали себя на седьмом небе. «Король умер. Да здравствует король!» Наконец-то вновь появилась работа. Вернулся смысл бытия! Опять можно одобрять, указывать, ставить на вид, запрещать, исключать. И, конечно, клеймить оппортунистов и уклонистов...

Результатом оживления большевистского духа явилось методическое пособие **«В помощь секретарям партийных организаций. Для обсуждения на открытых партийных собраниях»**. Гибрид творчества ГКЧП и умственных усилий первого секретаря Толочинского райкома И. Бобышева предписывал **«всем честным людям»** направить усилия **«на безусловное выполнение требований Государственного комитета по чрезвычайному положению»**.

И хотя Бобышев еще не получил официальную письменную «указивку» секретариата ЦК КПСС, но не забыл от имени **«абсолютного большинства людей»** поддержать решение хунты о закрытии ряда **«антиконституционных»** изданий.

Пока машинистка печатала семистраничный текст, Бобышев и его присные кинулись проводить встречи с трудовыми коллективами, освещая своим казенным авторитетом действия политических авантюристов. При этом так увлеклись внезапно возрожденной работой в массах, что потеряли счет времени. Понятно: «счастливые часов не наблюдают». И телепередач, увы, тоже...

Вечером 21 августа, когда дикторы раскованными голосами поносили ГКЧП, райкомовские лидеры, собрав толочинский актив, раздавали всем прихожим и приезжим ксерокопированные «методички», требующие повиновения долгожданной «твердой руке». Хотя и дрожащей...

Когда кадры, вооруженные идеологическим подспорьем, разъехались по заводам и хозяйствам, до райкома, наконец, дошли новости из Москвы.

Тут партийных командиров района зазнобило. «Надень-ка, брат Елдырин, на меня пальто... Что-то ветром подуло...» Пробормотав, говорят, нечто подобное, Бобышев принялся спешно сматывать удочки, заброшенные в разных углах района. Заржали моторы райкомовских машин, унося по пыльным проселкам самого И. Бобышева, второго секретаря В. Бирюкова, управляющего делами А. Полторака... Только что врученные директивы вежливо отнимали, обещая, что пришлют другие, получше. Изъятые бумаги в связи с «минованием надобности» быстренько «уничтожали на месте».

Но рукописи не горят, как справедливо заметил классик. Тем более не горят ксерокопии. Кое-кто из строптивых подчиненных сохранил свой экземпляр бобышевского «меморандума». Это было неприятно.

И вот тут 22 августа на свет Божий появляется хитроумное изобретение: постановление бюро РК КПБ, датированное, сами понимаете, 19-м августа. Новорожденный документ, состряпанный задним числом, дышал демократией и благородным гневом: **«Создание ГКЧП считаем противозаконным!»** Ну, и так далее..

Да вот беда: из членов бюро, кроме И. Бобышева, В. Бирюкова и предрайсовета И. Щурка, немедленно подписать «отпущение грехов» оказалось некому. Пришлось съездить за автографами к директору сельской школы С. Денисовой и директору совхоза В. Гончарову. Оставалось еще пятеро, но те были уж больно далеко. Короче, номер не прошел...

Читаю объяснения, которые дали участники вышеописанных событий прокурору района В. Лапцевичу, и словно смотрю вторую «серию» гоголевского «Ревизора». Комедия, заканчивающаяся немой сценой...

Толочинские чиновники продемонстрировали в прокуратуре дружную потерю памяти. Начисто забыли, кто сочинял «методичку», что говорилось на собраниях и совещаниях, когда составлялось, печаталось и подписывалось липовое постановление бюро.

Благо, нашлись в районе памятливые люди, а в райкоме — красноречивые документы. Впрочем, такое ли это благо? Неуютно быть современником доносов и допросов, пусть даже во имя демократии. Так и тянет сказать законникам, членам всяких комиссий: «Оставьте их, пусть идут с миром, ибо не ведали, что творили». Но тут же ловлю себя на мысли: «Ведали! Иначе не изворачивались бы теперь так отчаянно, не шли бы на подлог. А случись победа ГКЧП, досталось бы от них не только «ельциным, собчакам и яковлевым», но и «щелкоперам проклятым», и всем, кто не доверял «уму, чести и совести нашей эпохи».

И все-таки, наверное, не стоит бить лежачего. Вряд ли вновь поднимется к всевластию партия, центральный штаб которой за пять дней до переворота сообщает по спецсвязи своим полководцам: **«Считаем необходимым обратить особое внимание на сохранение кадров освобожденных партийных работников... ЦК КПСС предполагает в ближайшее время решить вопросы повышения их заработной платы».**

«Ближайшее время» рассудило по-своему.

«Обидели юродивого... отняли копеечку...»

Немалую, надо полагать!

Вот только за что платить обещали?

И из чьего кармана?

Сергей БУТКЕВИЧ.

Нам стала вядома

Галадоўка на плошчы

З 26 верасня на цэнтральнай плошчы Барысава галадае настаўнік гімназіі Алесь Кунчэўскі.

Ён аб'явіў бестэрміновую галадоўку «ў абарону чалавечых і грамадзянскіх правоў сваіх, сваіх блізкіх і ўсіх несправядліва пакрыўджаных простых людзей горада Барысава». У «Заяве-пратэсце», накіраванай ім у адрас сесіі Барысаўскага гарсавета, А. Кунчэўскі, як паведамляе карэспандэнт агенцтва «БелаПАН», патрабуе адстаўкі прэзідыума гарсавета і ўмацавання выканаўчай улады ў горадзе шляхам выбараў мэра горада ўсімі жыхарамі.

Сабчак у Парыжы

У Парыжы выходзіць у свет кніга мэра Санкт-Пецярбурга Анатоля Сабчака «Хроніка прадказанага краху», рускае выданне якой мае іншую назву — «Уваходжанне ва ўладу». Адзін з яе раздзелаў напісаны ўжо пасля падаўлення ў Савецкім Саюзе жнівеньскага путчу.

Як прызнаецца ў гэтай кнізе А. Сабчак, пераварот з'явіўся для яго «поўнай нечаканасцю».

У яго быў пункт апоры

У Вашынгтоне, Лос-Анджэлесе і Нью-Йорку пабывала выстаўка з 170 карцін, малюнкаў і архітэктурных макетаў беларускага мастака Казіміра Малевіча. Сярод водгукаў прэсы на гэту падзею ў культурным жыцці — «Малевіч змяніў усю гісторыю мастацтва» («Вашынгтон пост»).

Агенцтва «БелаПАН».

«Уцечка» золата з СССР

Нацыянальны польскі банк б'е трывогу: вось ужо другі месяц на «чорным» валютным рынку раптоўна пачала падаць цана золата. Адзін грам каштоўнага металу тут цяпер на 1—1,5 тыс. злотых таннейшы, чым у дзяржаўных магазінах.

Газета «Кур'ер польскі» прыводзіць сцверджанне ўладальніка канторы ў Гданьску, які заявіў, што «да яго рэгулярна прыходзяць рускія кліенты, якія прапануюць золата кілаграмамі».

Польскія мытнікі сцвярджаюць, піша «Газета выборча», што многія савецкія турысты прывозяць з сабой па 10—12 заручальных пярсцёнкаў, 20—30 залатых ланцужкоў. Праверыць усіх немагчыма, але вось, напрыклад, у нядзелю мытнікі кантрольна-прапускнога пункта ў Пшемыслі выпадкова выявілі ў аўтапакрышках «Лады» з СССР 1,5 кг залатога пяску.

«Кур'ер польскі» выказвае меркаванне, што за кулісамі нелегальных аперацый з каштоўным металам могуць стаяць савецкая мафія, вярхушка КДБ або КПСС.

Уладас БУРБУЛІС.

Абазналіся...

Шасцідзесяцівасьмігадовы галоўны рэдактар часопіса «Знамя» пісьменнік Рыгор Бакланаў мае намер у хуткім часе звярнуцца ў суды некалькіх краін з іскамі. Справа ў тым, што некалькі выданняў Францыі, Англіі і Аўстрыі ўключылі пісьменніка ў склад ГКЧП, апублікаваўшы яго фота ў ліку іншых путчыстаў з тлумачальным подпісам: «Алег Бакланаў».

Мяркуючы па ўсім, у судовых інстанцыях размова пойдзе не пра сімвалічныя сумы — па заканадаўству Францыі, напрыклад, прэтэнзіі могуць быць «ацэнены» ў некалькі сотняў тысяч франкаў. Пакуль толькі складана вызначыць, выйдзе з гэтага што-небудзь ці не.

Пісьмо, складзенае тысячамі

Адкрытае пісьмо Прэзідэнту СССР М. Гарбачову, Вярхоўнаму Савету СССР, Вярхоўнаму Савету і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь накіравалі жыхары горада Гомеля.

Каля 10 тысяч чалавек, якія падпісаліся пад пісьмом, патрабуюць неадкладнага ўводу ў дзеянне ўсіх артыкулаў Закона СССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», выканання ўсіх пунктаў Дзяржаўнай праграмы і пратакола ўрадавай камісіі ад 25 мая 1990 г.

Збор подпісаў працягваецца.

Ірына ФЕДАРАВА.
г. Гомель.

Будзем супрацоўнічаць?

Пачаць падрыхтоўку праекта Дагавора аб прынцыпах міждзяржаўных адносін паміж Літоўскай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь — такую мэту ставілі ўдзельнікі сустрэчы экспертных груп дзвюх суседніх рэспублік.

У час сустрэчы ў Мінску дасягнута дагаворанасць аб стварэнні рабочых груп для ўзгаднення пытанняў і выпрацоўкі праектаў дакументаў па праблемах супрацоўніцтва ў галінах эканомікі, экалогіі, мытных і консульскіх адносін, узаемадзеяння ў сферы сацыяльнага забеспячэння, дзяржаўных граніц, гуманітарнага, культурнага і навуковага супрацоўніцтва, а таксама правоў нацыянальных меншасцей.

Казіс УСЦЫЛА.

Зноў грашовая ліхаманка

Зноў трывожныя чуткі ўзрушылі жыхароў шэрагу гарадоў краіны. Пранеслася вестка аб тым, што чакаецца грашовая рэформа і ўзамен пяцідзесяці- і сторублёвых купюр будуць выдадзены аблігацыі. Як вынік, у ашчадных касах Казані, напрыклад, стоўпатварэнне. Людзі стараюцца пакласці на свае рахункі буйныя сумы. Нават за кватэру, тэлефон казанцы плацяць толькі пяцідзесяці- і сторублёвымі купюрамі.

Паводле вестак Татарскага рэспубліканскага ўпраўлення ашчаднага банка СССР, за дзень толькі ў Казані прынята ўкладаў на 20 мільёнаў 316 тысяч рублёў — у дзесяць разоў больш, чым у самыя «пікавыя» дні.

Мікалай САРОКІН.

Экспрэс-інфармацыя

Эканамічнае пагадненне і НЛА

Сэрца напаўняецца гордасцю, калі бачыш старт касмічнага карабля з адлегласці ўсяго ў некалькі соцень метраў. Ды яшчэ з міжнародным экіпажам.

Сорам і жаль прыходзяць на змену гэтаму пачуццю, калі назіраеш, як вытворцы лепшай у свеце касмічнай тэхнікі і іх госці хутка пасля запуску штурмуюць буфет Байканура. Пячэнне, сок, цукеркі, цыгарэты... Не ўсім дасталося, не ўсім пашанцавала.

Стварэнню новай эканамічнай мадэлі на пераходны перыяд былі прысвечаны некалькі напружаных дзён у Алма-Аце, дзе сабраліся прадстаўнікі амаль усіх незалежных рэспублік. Перагаворы закончыліся амаль сенсацыйным вынікам: дванаццаць з трынаццаці кіраўнікоў дэлегацый парафіравалі пагадненне. Але за гэтай аптымістычнай лічбай хаваюцца шмат супярэчнасцей і непаразуменняў.

Напрыклад, Украіна і Узбекістан здымалі свае подпісы, а потым узнаўлялі іх. У рэшце рэшт высветлілася, што кіраўнікі гэтых краін зусім па-іншаму разумеюць пагадненне, чым астатнія. Старшыня Савета Міністраў Беларусі Вячаслаў Кебіч з'яўляецца прыхільнікам новага эканамічнага аб'яднання.

Пакуль што невядома пазіцыя Барыса Ельцына. Каб даведацца пра яе, некалькі ўдзельнікаў перагавораў разам з прэзідэнтам Назарбаевым некалькі гадзін запар тэлефанавалі яму з Байканура, аднак безвынікова.

З гэтай нагоды значна затрымаўся наш зваротны рэйс. Але гэтая затрымка падаравала нам магчымасць назіраць адну дзівосную з'яву. На падлёце да Самары лётчыкі ўбачылі прама па курсу вялікі шар, які ярка свяціўся ў начным небе. Тонкая «нага» яго апускалася да зямлі. Што гэта, НЛА? Пакуль мы спрачаліся, шар знік.

Спадзяюся, што новае эканамічнае пагадненне не будзе чарговай паперай, пра якую забудуць праз тыдзень. Падрабязней аб сутнасці гэтага дакумента ў наступным нумары нашай газеты.

Уладзімір САМОЙЛАЎ,
аглядальнік «Народнай газеты».
Алма-Ата—Байканур — Мінск.

Московские новости

Какие пенсии у генералов?

Российский союз «Щит» — организация, выступающая в защиту социальных прав военнослужащих и их семей, — потребовала от правительства пересмотреть порядок назначения пенсий генералам и полковникам, уволенным из упраздненных военно-политических органов. А число таких большезвездных слуг ЦК КПСС, получающих в месяц по две-три тысячи рублей, исчисляется многими сотнями.

— За какие заслуги? — справедливо спрашивают активисты общественного объединения и требуют пересмотра порядка назначения пенсий.

Леонид ФАДЕЕВ.



Рисунок Олега ПОПОВА.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Востры момант

Блакада. Ці пераадолеем яе?

У «Народнай газеце» ўжо ўзгадвалася публікацыя ў парыжскай «Фігаро», у якой Беларусь названа «штучнай выдумкай савецкай улады», а народу адмоўлена ў праве на ўласную гісторыю. Літаральна дзень у дзень з «Фігаро» ў кіёскі Францыі паступіла яшчэ адно вельмі ўплывовае выданне — «Монд», на першай старонцы якога наша рэспубліка выстаўлена як краіна з «больш чым сумніцельнымі нацыянальнымі асаблівасцямі». І нарэшце ў адным з вераснёўскіх нумароў «Тайма» — зноў жа прыкрая недакладнасць у інфармацыі пра Беларусь.

Прыкметна, што ўсе гэтыя выданні маюць вельмі вялікі тыраж; у іх друкуюцца сусветна вядомыя спецыялісты, іх супрацоўнікі маюць імгненны кампьютэрны доступ да інфармацыйных банкаў; выпадковыя накладкі і недакладнасці тут выключаны.

Альбо паглядзіце інфармацыйныя каналы ЦТ, разгарніце «Московские новости» альбо «Комсомольскую правду» — шмат там пра Беларусь?

У момант, калі прызнанне рэспублікі сусветным супольніцтвам набывае прынцыповае значэнне, Беларусь апынулася ў інфармацыйным вакууме. А больш дакладна — у блакадзе.

Не буду цяпер аналізаваць палітычныя прычыны такой сітуацыі — без сумневу, існуюць сілы, якія бачаць у гэтым выгоду. Але, калі пакласці руку на сэрца, трэба прызнаць: у сцяну глухога маўчання не адна і не дзве цагліны былі пакладзены і з нашага боку.

Журналісты памятаюць, з якім скрыпам ішлі ў колішніх цэнтральных выданнях і на тэлебачанні матэрыялы, у якіх кідаўся хоць нават невялікі цень на «дасягненні працоўных Савецкай Беларусі ў справе будаўніцтва камунізму». Кіраўніцтва рэспублікі было традыцыйна зацікаўлена ў стварэнні станоўчага іміджу — даходзіла да таго, што ў органах друку вербаваліся «свае» палітычныя цэнзары, якія, здаралася, здымалі артыкулы з палос за гадзіну да падпісання нумара ў свет. І ад мінскіх карэспандэнтаў цэнтральнай прэсы патрабавалася ўсё тое ж: лаяльнасць да рэжыму. Узамен — лепшыя кватэры, машыны, прэстыжныя пуцёўкі. Вядома, не ўсе падпарадкоўваліся правілам гульні — прыгадаем выступленне Мікалая Матукоўскага па мазырскай справе альбо акцыю Анатоля Казловіча супраць татальнай меліярацыі, — але колькі гневу вылілася на

Прэса, паводле выказвання аднаго з сакратароў ЦК КПБ, з'яўлялася «падлакотнікам партыі», партыя ж займалася падманам. Калі ж ісці па шляху метафары, то прэса прыпадобнілася нават не паслухмянаму рэтранслятару, а шчыльнаму фільтру: у грамадстве суцэльнага размеркавання інфармацыя дазіравалася, як будаўнічыя матэрыялы альбо імпартныя боты, — у строгай адпаведнасці з сацыяльна-партыйным статусам: чым ніжэй — тым менш. На чале сродкаў масавай інфармацыі прызначаліся, як правіла, людзі з ЦК: загадчыкі сектараў, намеснікі загадчыкаў аддзелаў, памочнікі першага сакратара. Не называю імёнаў — справа не ў асобах, а ў агульным крытэрыі да гэтых асоб: адданасць, паслухмянасць і ўжо, вядома ж, адсутнасць ініцыятывы. Праўда, і тут здараліся «праколы», але часцей за ўсё кадравая палітыка была беспамылковай. І дзіўная рэч: новыя часіны надышлі, а герметычнасць клана захоўваецца непарушна: на адказныя пасады ідуць людзі з той жа абоймы.

Абоймы, якая вельмі выразна сябе праявіла пасля красавіка 1986 года, калі свядомае замоўчванне чарнобыльскай катастрофы паставіла нацыю перад пагрозай фізічнага знішчэння.

Здавалася б, мы павінны былі аднойчы і назаўсёды ўсвядоміць, як недаравальна дарага абыходзіцца нам непрафесіяналізм і легкадумнасць. Пяць гадоў — дастатковы для гэтага тэрмін. Сёлета нас напаткаў яшчэ адзін ўдар, нанесены экспертамі МАГАТЭ, якія ў вачах сусветнага грамадства паставілі чарнобыльскую трагедыю на ўзровень падзеі, не вартай асаблівай увагі. У нейкай іншай дзяржаве адразу была б арганізавана кампанія масіраванай контрпрапаганды — дзесяткі груп навукоўцаў, палітыкаў, журналістаў раз'ехаліся б па свеце з лекцыямі ды прэс-канферэнцыямі; праводзіліся б шырокія акцыі з запрашэннем замежных дэлегацый і карэспандэнтаў. Гэта, вядома, каштавала б грошай, але, безумоўна, акупілася б і спачуваннем і дапамогай.

Толькі ж мы — людзі сціплыя. Украінцы адправілі Краўчука на амерыканскі кантынент з такой праграмай, што ледзь не кожны дзень — рэпартажы на ЦТ; Ельцын у ЗША ўзяў каманду з сарака чалавек — зноў жа падрабязнае асвятленне візіту ў «мясцовай» прэсе. Цяперашні візіт Станіслава Станіслававіча ў ФРГ абстаўлены па ўсіх правілах канспірацыі — ну, хіба што апламбіраванага вагона не было. Затое цьмянасці і супярэчлівых каментарыяў хапала.

Дробязі? Калі і дробязі, то з разраду тых, якія фарміруюць прэстыж дзяржавы, яе палітычнае аблічча. Пажадана, каб аблічча гэтае было пазбаўлена комплексу правінцыяльнай непаўнаважкасці.

Спрыяць прарыву блакады магло б БелТА — адзінае дзяржаўнае агенцтва. Аднак па сённяшні дзень уся інфармацыя з Мінска фільтруецца праз замежны аддзел ТАСС, і можна ўявіць, у якой інтэрпрэтацыі яна выходзіць з маскоўскіх офісаў на Рэйтэр альбо Асашэйтэд прэс. Значыць, трэба шукаць прамыя кантакты з замежнымі агенцтвамі. Мэтазгодна было б адкрыць у Мінску філіял беларускай рэдакцыі радыё «Свабода», якое мае мільёны слухачоў па ўсім свеце. Нарэшце, у той жа Маскве ёсць дзесяткі карэспандэнцкіх пунктаў ледзь не ўсіх уплывовых выданняў, журналісты якіх вымушаны карыстацца тасаўскай стужкай і (пераканаўся на ўласным вопыце) вельмі ўдзячныя за аператыўную інфармацыю з першых рук. Дарэчы, і «Народная газета» — парламенцкае выданне суверэннай Беларусі — магла б мець уласных карэспандэнтаў у буйнейшых дзяржавах свету — на пачатак у Парыжы, Нью-Йорку і суседняй Варшаве.

А Пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі ў Маскве? Менавіта яно павінна наладжваць рэгулярныя прэс-канферэнцыі лідэраў парламента і ўрада — балазе, што для гэтага ёсць шыкоўны палац і велізарны штат супрацоўнікаў. Някепскія ўмовы для пашырэння інфармацыйных кантактаў маюць і нашыя прадстаўнікі ў Нью-Йорку, Парыжы, Жэневе. Безумоўна, што і дзейнасць Міністэрства замежных спраў у гэтым накірунку трэба скарэкціраваць.

Увогуле ж павінна існаваць дзяржаўная, цэласная канцэпцыя развіцця сродкаў масавай інфармацыі, пабудаваная на прынцыпах свабоды слова, рыначных і канкурэнтных пачатках. Тут — і змяненне структуры цяперашняга Дзяржтэлерадыё, спрыянне незалежным і камерцыйным тэлеграфным агенцтвам і відэаканалам — пры безумоўным прыярытэце беларусізацыі, прапагандзе нацыянальнай культурнай спадчыны.

І, нарэшце, трэба неадкладна прыняць Закон аб друку. У нашай камісіі амаль год назад распрацаваны пакет заканадаўчых дакументаў, якія ствараюць прававыя ўмовы для свабоднага распаўсюджвання інфармацыі, але іх разгляд адкладваецца ад сесіі да сесіі.

Далей адкладваць ужо нельга—кожны тыдзень прамаруджвання абыходзіцца занадта дорага.

Сяргей НАВУМЧЫК,
народны дэпутат Рэспублікі Беларусь, сакратар Камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека.

Прывід ці іншапланецянін

КАСТРАМА. Гісторыі, звязаныя з «замагільнымі сіламі» на старых могілках, папоўніліся, відаць, яшчэ адным прыкладам. Фотааматар Уладзімір Яшын быў нямала здзіўлены, калі праявіў плёнку, якую адзняў у гарадскім парку. На адным з негатываў сярод дрэў, інтрыгуе чытачоў газета «Северная правда», дакладна вырысоўваўся невядома адкуль узяты буйны мужчынскі твар.

Газета ўпамінае аб гісторыях, калі пры здымках на могілках на негатывах час ад часу праяўляліся твары даўно памерлых. А старажылы Кастрамы пацвердзілі, што раней на месцы парку стаялі некалькі царкоўных сабораў, якія былі падарваны ў трыццатыя гады. Ля іх сцен былі пахаванні, ад якіх цяпер не засталося слядоў.

Крыміналісты кастрамской міліцыі пацвердзілі, што размова не ідзе аб тэхнічнай памылцы або мантажы. І тады экспертызу прадоўжылі экстрасенсы, якія заявілі, што ад здымка зыходзіць моцны ток «духоўнай энергіі». Праўда, адны сцвярджаюць, што гэта жывы чалавек, іншыя бачаць у ім касмічнага прышэльца.

(ТАСС).

Рэзананс

Рассеется ли туман над Беларусью?

12 сентября под заголовком «Над Белоруссией густой туман» наша газета опубликовала тревожные размышления инженера Евгения Лебедко. Статья вызвала широкий читательский резонанс. Публикуя сегодня отклики, мы, как обычно, стараемся представить самые разные точки зрения на происходящие в нашей республике события...

Хто перамог?

Гэта пытанне не пакідае мяне ні ўдзень, ні ўначы, не дае спакою.

Сапраўды, галоўка выканаўцаў антыканстытуцыйнага дзяржаўнага перавароту ў турме, вядзецца следства. Дзейнасць мазгавога цэнтра путчыстаў — КПСС прыпынена.

Дык чаму ж усё болей трывожна на душы за заўтрашні дзень, за вынікі нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР?

Таму, што перамога дэмакратычных сіл у адносінах да Беларусі настолькі ілюзорная, што выклікае не радасць, а пачуццё смяротнай небяспекі.

Ад Вярхоўнага Савета рэспублікі да мясцовых Саветаў усіх узроўняў пераважная большасць дэпутатаў — гэта верныя служкі партыйнай іерархіі КПБ.

Хто з'яўляецца дэпутатамі Слаўгарадскага раённага Савета народных дэпутатаў? Усе старшыні калгасаў, старшыні сельскіх Саветаў, сакратары райкама прыпыненай КПБ і сакратары пярвічных партыйных арганізацый.

А цяпер паглядзіце на склад членаў райкама КПБ і параўнайце яго з дэпутацкім корпусам райсавета. 90 працэнтаў з іх — гэта адны і тыя ж людзі! Гэта той медаль, у якога абодва бакі — блізняты. Дык аб якой перамозе дэмакратыі можна гаварыць?

Але лепей я спашлюся на канкрэтныя факты. 19 жніўня ад імя бюро Слаўгарадскага РК КПБ і выканкама райсавета ў Маскву пайшла тэлеграма ў падтрымку путчыстаў.

21 жніўня на партыйна-гаспадарчым раённым активе ўдзельнікі яго падтрымалі прапанову першага сакратара РК КПБ Г. Краўчанкі накіраваць прывітальную тэлеграму хунце ад імя працоўных раёна.

Яе тэкст ужо ляжаў у апаратнай рэдакцыі раённай газеты для перадачы ў Магілёў, ды ў гэты момант стала вядома, што хунта арыштавана. Вядома ж, тэкст хуценька знішчылі.

Але тэкст першай тэлеграмы ад 19 жніўня захаваўся. Аб гэтым я атрымаў афіцыйны пісьмовы адказ 30 жніўня на свой дэпутацкі запыт ад выконваючага абавязкі пракурора Слаўгарадскага раёна В. Бурноса.

1 верасня ў Слаўгарадзе адбыўся агульнагарадскі мітынг у падтрымку Прэзідэнта Саюза М. Гарбачова і Прэзідэнта Расіі Б. Ельцына.

Слаўгарад — гэта не Мінск і нават не Бабруйск. Аб пазіцыі кіраўнікоў раёна было добра вядома кожнаму. Таму і прагучала ў рэзалюцыі патрабаванне аб адстаўцы выканкама райсавета і рэдактара раённай газеты «Ленінскае слова» В. Ігнатавай (яна адначасова і сакратар РК КПБ па ідэалогіі).

Аб кіраўніцтве РК КПБ ніякіх патрабаванняў не выстаўлялася, бо дзейнасць райкама прыпынена, а памяшканні апячатаны і ўзяты пад ахову супрацоўнікамі райаддзела МУС.

І вось 6 верасня адбылася сесія раённага Савета. Можа, думаеце, «народныя выбраннікі» падтрымалі патрабаванні соцень сваіх выбаршчыкаў?

Як бы не так! Першы перапалох пасля няўдалага дзяржаўнага перавароту прайшоў, члены прыпыненага ў сваёй дзейнасці райкама цясней згуртавалі свае рады вакол беспрацоўнага «першага» — ён таксама дэпутат райсавета — і не пагадзіліся з патрабаваннямі рэзалюцыі мітынгу, якія закранулі кагосьці персанальна.

Але каб паказаць сваю прыхільнасць дэмакратыі, згадзіліся з патрабаваннем надрукаваць поўны тэкст рэзалюцыі мітынгу ў раённай газеце.

11 верасня газета надрукавала тэкст рэзалюцыі, але дадала да яго каментарый «Ад рэдакцыі». Гэта права рэдакцыі. Але вось што цікава, — і няўзброеным вокам бачны почырк сакратара РК КПБ па ідэалогіі В. Ігнатавай — вернай служкі «руководящей и направляющей».

Усе вышэй прыведзеныя прыклады яскрава сведчаць аб тым, што гаварыць аб перамозе дэмакратычных сіл у Беларусі — гэта значыць свядома працаваць на рыхтуючыхся да рэваншу Малафеева, Камая, Ціхіні і іншых.

Ніколі не аддадуць без смяротнай бойкі ўладу ні Малафееў, ні Камай, ні партыйныя фюрары ніжэйшых узроўняў. А калі ўсё ж не ўтрымаюць, то тады з падполля будуць усімі сіламі перашкаджаць нам будаваць сапраўды свабодную і незалежную ад любых ідэалогій Беларусь. Для гэтага і ўладкоўваюцца партыйныя функцыянеры сёння на кіруючыя пасады ў Савет Міністраў, аблвыканкамы, буйныя прадпрыемствы, ад якіх залежыць заўтрашні дзень нашай рэспублікі.

І аб гэтым трэба памятаць кожнаму, хто не згодзен болей жыць у камуністычнай канюшні.

Вось чаму трывожна на душы і хочацца крыкнуць на ўсю маю шматпакутную Белую Русь: «Браты-беларусы! Няўжо вы не жадаеце людзьмі звацца?»

Фелікс ШКІРМАНКОЎ,
інвалід вайны II групы,
дэпутат гарсавета.
г. Слаўгарад.

Эх, жыццё...

Якія б змены ў лепшы бок у краіне ні адбываліся, а многія вясковыя жанчыны дасюль не выпускаюць з рук касу, «трэніруюць» свае рукі. А куды падзецца, як, скажам, жыхарцы вёскі Багдзюкі Жабінкаўскага раёна Марыі Дзям'янаўне Швед, калі няма гаспадара. Трэба ж і свінням травы накасіць, і авечкам на зіму сена нарыхтаваць. Хаця не жаночая гэта рабста, але жыць неяк трэба.

Задумаўся ветэран вайны Міхаіл Паўлавіч Карнееў, што жыве ў Жабінцы. І ёсць над чым. Удзельнічаў у Сталінградскай і Курскай бітвах, а цяпер, дзякуючы талоннай сістэме, атрымаў у месяц тры пачкі цыгарэт. Змагаўся за светлае будучае, а нават накурыцца ўдосталь і то не можа...

Фота Аляксея ГАНЧУКА.

Мне боязно...

Взяться за перо меня заставила, как выстрел в спину, эта статья. Мне больно за партию КПБ—КПСС, за миллионы честных коммунистов, за память о моем отце-коммунисте, умершем в 1961 году. Отец отдал 30 лет партии и всегда честно исполнял свой гражданский и партийный долг. Мне страшно читать статьи, в которых авторы упиваются беспрецедентной клеветой на КПБ, на правительство.

Позвольте, господа, я ведь тоже народ, сотни тысяч белорусских коммунистов тоже народ. А мы не только не разделяем ваших взглядов, но и будем бороться с ними. Будем бороться за партию коммунистов, за справедливость, за демократию и за хорошую, сытую, благополучную жизнь. Будем бороться без угроз, без запугивания голодом и холодом, а своим трудом, сплоченностью, убеждением.

К чему вы зовете народ, инженер Лебедко? Я все-таки не теряю надежды на здравый смысл большинства белорусов. Ведь сейчас у нас нет равнодушных, каждый человек разделяет мнение коммунистов или антикоммунистов.

Я простая служащая, 58 лет, пенсия — 105 рублей, образование высшее, работаю, так как без работы на пенсии не проживу, коммунист с двадцатишестилетним стажем. В партию вступила по убеждению. Привилегия одна — быть по мере сил на передовой. Поэтому сейчас могу говорить о незаслуженных и совершенно недопустимых привилегиях некоторых коммунистов, о недостатках в руководстве КПСС, но об огульном охаивании коммунистов не хочу и слышать. Точно так же, как и о смене государственного строя.

Алина АЛЕКСАНДРОВИЧ.
г. Минск.

Безуладдзе...

19 верасня беларускі парламент прызнаў дзяржаўным сцягам гістарычны сцяг беларускага народа.

У той жа дзень пасля прыняцця Закона аб сімволіцы мясцовыя патрыёты ў Ганцавічах узнялі над будынкам райсавета (і былога райкама КПБ) нацыянальны сцяг.

Час быў пад вечар. А на раніцу над будынкам зноў лунаў сцяг неіснуючай дзяржавы. Скінулі беларускую сімволіку. Здалося на першую думку, што зноў прыйшоў ДКНС.

Але яшчэ праз гадзіну знялі і былы дзяржаўны сцяг, і масіўны герб БССР. Але замест нічога не знайшлі.

Безуладдзе?

М. ЛЕНКАВЕЦ.
г. Ганцавічы.

Дзяржава супраць асобы

«НОВАГА ЖЫЛЛЯ МЫ ЁЙ НЕ ПРАДАСТАВІМ. ДА САМАЙ СМЕРЦІ...»,

альбо Пра рабскае жыццё Лідзіі Арсеньеўны Гвоздзік

ЛІДЗІЯ Арсеньеўна спусцілася з ганка і пабрыла ў бок сваёй хацінкі з такім жа няшчасным лёсам, як і яе ўласны. Седзячы ля паўразваленай печы, яна не верыла больш ні ў што: ні ў новыя дэмакратычныя пераўтварэнні, ні ў незалежную Беларусь і толькі гаварыла нам: «Тут я і памру...»

Так, у нашай краіне простаму чалавеку, які ўсе сілы аддаў на карысць Айчыны, на лепшыя адносіны да сябе спадзявацца не даводзіцца. Нехта ўжо ездзіць па незалежнай Беларусі на «Мерсэдэсах», нехта адбудаваў шматпавярховыя загарадныя вілы, а адзінокім старым дзяржава прадаставіла адзіную прывілею — легчы і памерці ў сваіх развалінах.

***

Лідзія Арсеньеўна Гвоздзік жыла са старой маці ў суседняй вёсцы Сакалова. Чатыры гады назад хата згарэла. Часова прытуліліся ў суседзяў. Пайшла да старшыні калгаса імя Чапаева Івана Андрэевіча Мацкевіча. Куды ж падацца, як не да свайго «галавы», які на вёсцы і бог, і цар? Ён прапанаваў пераехаць сюды, у Верхняе. Спачатку адмаўлялася, хацелася дажыць свой век там, дзе прайшло жыццё. Перакнаў старшыня перабрацца ў гэту старэнькую хаціну, запэўніў: вясною новы дом пабудуем. Паверыла. Асабліва ўзмацнілася гэта вера, калі залілі фундамент і старшыня адправіў бабульку ў раён «выбіваць» матэрыялы. Маўляў, яна льготніца, а так калгасу нічога не дадуць. З даведкай у руках Лідзія Арсеньеўна пачала хадзжэнні па кіруючых кабінетах Глыбокага. Даведка была выдадзена ў тым, што «...у 1988 годзе яна была пастаўлена на чаргу для набыцця будаўнічых матэрыялаў (чарга льготная, як інваліду працы і пагарэльцу): цэглы — 8 тысяч штук, блокаў сілікатных — 30 кубічных метраў, шыферу — 300 лістоў, цэменту 5 тон».

— Ездзіла я ў райцэнтр на аўтобусах, у дождж і ў холад, хоць цяжка было неймаверна. Але ж для сябе старалася, — расказвае Лідзія Арсеньеўна.

— Ад будоўлі я не адыходзілася. Папрасіла, каб у хляве катухі зрабілі. Тры бутэлькі віна паставіла. Старалася, вымятала смецце, мыла вокны. Нарэшце пайшлі засяляцца. Тут старшыня і сказаў: «Вялікаватая для вас дваіх хата, мужчын падселім». Мы з мамай плачам: «Чаму ж іншым нікога не падсяляюць?» Паабяцаў тады старшыня пабудаваць нам другі, меншы дом. Толькі зноў жа, каб я паехала матэрыялаў выбіла. Зноў стала ездзіць. Праўда, мама новага дома не прычакала. Не прычакаю, відаць, і я...

Яшчэ адна даведка з'явілася ў Лідзіі Арсеньеўны, выдадзеная ў тым, што «ёю былі заключаны ў Глыбоцкім ПСГУ два дагаворы: на выраб стаярных вырабаў на суму 335 рублёў 33 капейкі (6 акон, 3 дзвярэй, адны з іх уцепленыя)». Яшчэ розныя дошкі...

Доўга можна апісваць, як яна абходжвала і гэты новы дом і як засялілі ў яго другую сям'ю, якім гэта ўдарам было для старой адзінокай жанчыны. А старшыня прапануе ўжо будаваць трэці дом, цяпер на месцы былога пажарышча ў вёсцы Сакалова. Толькі зноў жа матэрыялы трэба дастаць...

Не хоча яна больш нікуды выязджаць. Дайце ёй тое, што яна здабывала ўласнымі сіламі, праявіце элементарную чалавечнасць. Не далі і не праявілі. Яе цярпенне лопнула. Стала ездзіць у Мінск. Тады ў яе яшчэ жыла вера ў вышэйшую справядлівасць, у ЦК. Пабываўшы на прыёме ў сакратара ЦК КПБ А. Камая, вырашыла выйці на плошчу перад Домам урада і аб'явіць галадоўку...

А ёй ішлі пісьмы ў адказ:

«На Вашу заяву ў Вярхоўны Савет БССР, паступіўшую ў аблвыканкам на разгляд, паведамляем, што калгасам імя Чапаева Вам прапанаваны пасля рамонту жылы дом у в. Верхняе. Іншай магчымасці палепшыць Вам жыллёвыя ўмовы няма.

Загадчык прыёмнай па скаргах С. А. Завароўскі».

«На Вашу тэлеграму ў ЦК Кампартыі Беларусі паведамляю, што Вам неаднойчы прапанавалі палепшыць жыллёвыя ўмовы. Аднак ад перасялення ў асобны добраўпарадкаваны жылы дом Вы неабгрунтавана адмовіліся. У выніку прадназначаны Вам дом рашэннем агульнага сходу калгаснікаў выдзелены іншай сям'і, якая, як Вы ведаеце, ужо яго засяліла. У сапраўдны час вольнага жылля ў калгасе няма.

Прапанавана старшыні Глыбоцкага раённага Савета народных дэпутатаў, першаму сакратару райкама партыі т. Акуленка В. І. сустрэцца з Вамі і знайсці рашэнне Вашай жыллёвай праблемы.

Адказны арганізатар аддзела арганізацыйнай работы ЦК Кампартыі Беларусі В. Рудзянок».

Бадай, адзінае, чаму выдатна навучыліся нашы «адпісчыкі», дык гэта старанна пісаць «Вы» з вялікай літары. Унікнуць у тое, як будавалі дамы і як «прапанавалі» паляпшаць жыллёвыя ўмовы Л. А. Гвоздзік, як яна «неабгрунтавана» адмаўлялася ад жылля, не пажадаў ніхто. Не ведаю, як знаходзіў рашэнне жыллёвай праблемы ў час сустрэчы з жанчынай першы сакратар райкама КПБ Акуленка, але адзіным прытулкам для Лідзіі Арсеньеўны застаецца ўсё тая ж, па сутнасці непрыгодная ў такім стане для жылля хатка.

***

Гутарка ў кабінеце старшыні калгаса наконт справы аб будаўніцтве дома для Л. А. Гвоздзік нагадвала нейкі фарс. Іван Андрэевіч звыкла выклікаў па тэлефоне неабходных «сведак», якія наперабой даказвалі, што гэта Лідзія Арсеньеўна сама не хацела ісці ў добраўпарадкаваныя дамы, што падсялялі ёй не мужчын, а дзяўчат, і то толькі тады, калі яна адмовілася засяляцца, што парывалася яна насільна захапіць кватэру пасля таго, як толькі што сама ад яе адмовілася, і г. д. Адным словам, нейкі непаслядоўны абсурд, дзе канцы з канцамі ніяк не зводзяцца.

Увогуле, сказаць можна ўсё, што захочаш. Ісціну ж трэба ўстанаўліваць дакументальна. І тут адкрылася нечаканае. Падобна на тое, што ніякага новага дома для Л. А. Гвоздзік старшыня і не збіраўся будаваць. Пэўна, разлічваў, што старая жанчына змірыцца і дакаратае свой век у старой будыніне. Бо рашэння праўлення калгаса аб выдзяленні ёй жылля, як выявілася, не існуе і не існавала. І, зразумела, яна не мела ніякіх законных падстаў заняць ні першую, ні другую, ні трэцюю кватэру.

Тыя ж, хто прэтэндаваў на жыллё, бачылі ў жанчыне з чужой вёскі толькі свайго канкурэнта. Неварухнулася іх сумленне нават хоць бы таму, што будаўнічыя матэрыялы яна здабыла для іх, выступаючы ў якасці пагарэльца. Пагарэльцам засталася і да сённяшняга дня.

Сам жа малады старшыня жыве, можна сказаць, больш чым заможна. Не выключана, што частка з 300 здабытых бабулькай лістоў шыферу ляжыць сёння на страсе яго манументальнай каморы ці на хляве з чатырма варотамі. Старшыня лічыць, што такіх умоў жыцця ён заслугоўвае як кіраўнік.

А чаго заслужыла, аддаўшы ўсё здароўе калгасу, Л. А. Гвоздзік? Толькі старой хацінкі?

— Новага жылля мы ёй не прадаставім. Да самай смерці, — жорстка заключыў Іван Андрэевіч.

У гэтым можна не сумнявацца. Бо такая наша калгасная сістэма, дзе старшыня—вышэйшая ўлада, дзе ўся ўласнасць, здабытая працай соцень людзей, — як бы яго асабістая. І толькі ён вольны вырашыць, што каму даць ці не даць. І таму, у надзеі на добразычлівасць старшыні, так агрэсіўна ахайвалі старэнькую бабульку яго падначаленыя. Толькі можна не сумнявацца, што некалі і яны апынуцца ў становішчы Л. А. Гвоздзік, якая асмелілася падняць голас супраць такой сістэмы. Бо лад жыцця, пры якім заробленае ўласным потам выпрошваецца, нібы міласціна, не што іншае, як звычайнае рабства.

Ці доўга будуць заставацца пакорнымі рабамі нашы калгаснікі?

Іван ГЕРАСЮК,
аглядальнік.
Глыбоцкі раён.

В ДВУХ СЛОВАХ

ТАСС • «ИНФО-НОВА» • «НАРОДНАЯ ГАЗЕТА»

ВЗОРВАЛСЯ ЭШЕЛОН

2 октября в 9 часов 18 минут в Тбилиси у станции метро «Дидубе» начали поочередно взрываться вагоны грузового состава на проходящей рядом магистральной железной дороге Тбилиси—Москва.

По предварительным сведениям, в эшелоне перевозились взрывчатые вещества, предположительно порох. Очевидцы сообщают, что над локомотивом состава произошел обрыв высоковольтной линии, провода которой вызвали короткое замыкание и пожар.

А ЗОЛОТО ВРОЗЬ...

Казахстан предпринимает шаги по созданию золотого запаса и алмазного фонда республики, что предусмотрено указом Президента Нурсултана Назарбаева.

Со следующего месяца все произведенное на территории республики чистое товарное золото и серебро будет реализовываться специально созданному консорциуму «Казалмаззолото».

ПРЕДСКАЗЫВАЮТ МАССОВУЮ ЭМИГРАЦИЮ

Около двух миллионов эмигрантов из Советского Союза, бывших советских республик и ряда восточноевропейских стран будут ежегодно выезжать на Запад в нынешнем десятилетии. Большая часть из них — примерно полмиллиона — направится в ФРГ, причем в массе своей это будут скорее работники низкой квалификации.

Об этом сообщается в докладе, который подготовил базирующийся в Лондоне инвестиционный банк «Кредит сюисс ферст Бостон».

ОРЕХИ С МАРИХУАНОЙ

В результате операций, проведенных таможенным комитетом СССР, МВД СССР и КГБ СССР во взаимодействии с таможенными и правоохранительными органами ФРГ, Нидерландов и Бельгии, успешно завершена операция «Карусель» по выявлению и пресечению контрабандной переправки крупной партии наркотиков из Афганистана транзитом через СССР в Западную Европу, предпринятой международной наркомафией. Как сообщила пресс-служба таможенного комитета СССР, результатом операции стало изъятие из незаконного оборота 3 тонн марихуаны.

ПЕРВЫЙ АВИАРЕЙС ПРОВАЛИЛСЯ

Самолет авиакомпании «Аэролихт», который впервые во вторник должен был доставить еврейских эмигрантов из Советского Союза прямым рейсом Москва — Тель-Авив, приземлился в среду в Израиле. Как сообщило агентство Рейтер из Тель-Авива, на борту самолета находилось всего лишь восемь человек. По мнению представителя «Аэролихта», столь незначительное число пассажиров объясняется отсутствием координации действий авиакомпании с еврейским агентством, ответственным за перевозку иммигрантов в Израиль.

ПРИОСТАНОВЛЕНА ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КОМПАРТИИ

Приостановлена деятельность Компартии Таджикистана и ее правопреемницы до установления прокуратурой республики степени ее причастности к августовским событиям. Такое решение принято после длительных дебатов на чрезвычайной сессии таджикского парламента.

ПОСОЛЬСТВО США — В ВИЛЬНЮСЕ

Торжественное открытие посольства Соединенных Штатов Америки в Литовской Республике состоялось в Вильнюсе.

Посольство США — второе дипломатическое представительство стран Запада в Вильнюсе. Несколько недель назад состоялось открытие аналогичного представительства Швеции.

ПРИ ЗАГАДОЧНЫХ ОБСТОЯТЕЛЬСТВАХ

3 октября около трех часов дня в столовую 48 в г. Владивостоке вошел подполковник одной из частей Тихоокеанского флота Ю. Воронкин со свертком в руке. Он силой увлек директора столовой В. Матросова в его кабинет. Вскоре там прогремел взрыв. Раненный директор выскочил из окна, а мертвый офицер остался лежать на полу с размозженной головой.

ДЕМОКРАТИЗАЦИЯ И АДАПТАЦИЯ

